УДК 378.147

А. А. Крыварот, ст. выкладчык; В. К. Мароз, дацэнт

# ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

The article describes the process of developing innovative teaching technologies in the Republic of Belarus in the recent five-year period.

На сучасным этапе стан інавацыйнай дзейнасці, непасрэдна звязаны са стратэгіяй развіцця адукацыі і дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, істотна ўплывае на агульны ўзровень развіцця самога грамадства – эканомікі, тэхнікі, інфармацыі, усіх структурных кампанентаў культуры – палітыкі, права, мастацтва, навукі. Інавацыйная палітыка Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з канцэпцыяй, прынятай на 2003–2007 гг. У дакуменце адсочаны тэндэнцыі развіцця інавацыйных працэсаў у свеце, стан інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, мэты і задачы інавацыйнай палітыкі дзяржавы і інш. [1]. Інавацыйная палітыка ў адукацыі разглядаецца як важная частка дзяржаўнай інавацыйнай палітыкі і скіроўваецца на падрыхтоўку кадраў, арыентаваных на інавацыйную дзейнасць. Набыткі ў гэтай галіне стварылі перадумовы для развіцця новага напрамку, які атрымаў назву *педагагічная інаватыка*. У межах педагагічнай інаватыкі распрацаваны формы інавацыйнай дзейнасці, скіраванай на актыўнае засваенне студэнтамі спосабаў пазнання: адбываецца перанос з традыцыйнага засваення сацыякультурнага вопыту ў выглядзе ведаў, уменняў і навыкаў на стымуляванне навучэнцаў да актыўнага пошуку адказаў на праблемныя пытанні.

Пераход ад экстэнсіўнага этапу адукацыйнай рэформы ў Рэспубліцы Беларусь да інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу вылучае на першы план праблему якасці і эфектыўнасці адукацыі, а таксама інавацыйнай практыкі. Узнікае патрэба, па-першае, інтэрактыўнага, дыялагічнага падыходу да зместу, працэсу і тэхналогіі адукацыі, што забяспечвае мэтанакіраванае фарміраванне асобы студэнта і адпавядае сацыяльна значным эталонам высокага ўзроўню якасці; па-другое, фарміруе асобу, якая будзе арыентавана на сацыяльныя каштоўнасці і якая валодае неабходнымі рэсурсамі і сродкамі самастойнага вырашэння пастаўленых задач [3, с. 19]. У адпаведнасці з трыма ўзроўнямі навучальных мэтаў (рэпрадукцыйным, класіфікацыйным, творчым) навучэнец сам вызначае, на якім узроўні яму спыніцца. Адметнасць інавацыйнай педагагічнай дзейнасці ў тым, што яна патрабуе ўзгодненых дзеянняў як студэнта, так і выкладчыка. Інавацыйны клімат ствараецца на аснове ўзаемадаверу і адначасова высокай патрабавальнасці, на прызнанні права студэнтаў рабіць самастойныя высновы і на выхаванні адказнасці за рэалізацыю новых мэтаў і задач. У якасці адукацыйна-выхаваўчых інавацыйных формаў актыўнага навучання могуць выкарыстоўвацца імітацыйныя і неімітацыйныя метады арганізацыі заняткаў: праблемныя бінарныя лекцыі, навуковыя студэнцкія канферэнцыі, падрыхтоўка рэфератаў як традыцыйныя формы перадачы інфармацыі спалучаюцца з імітацыйна-гульнёвымі метадамі, скіраванымі на вырашэнне канкрэтных праблемаў.

На перспектыву кожная кафедра павінна клапаціцца пра свой уклад у фарміраванне інфраструктуры стратэгічнага і аператыўнага менеджменту вну. Дзеля гэтага павінна стварацца база асноўных інавацыйных прапаноў як выкладчыкаў, так і студэнтаў, што дасць магчымасць атрымаць інавацыйную карту актыўнасці вну ў арыентацыі на канкрэтныя галіны вытворчасці. А гэта, у сваю чаргу, дазволіць вну забяспечыць мэтанакіраваную дзейнасць па перадачы вынікаў інавацыйных пошукаў на рынак інавацыйнай прадукцыі. У сучасных умовах традыцыйная лінейная мадэль інавацый (фундаментальныя даследаванні – прыкладныя даследаванні – распрацоўка і ўкараненне) скіроўваецца да адкрытай інавацыйнай мадэлі, дзе канчатковыя вынікі залежаць ад эфектыўнага кіравання сістэмай у цэлым. Акрэсліваюцца новыя крытэрыі сацыяльнага статусу універсітэтаў: вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны быць арыентаваны на перанос ведаў на эканоміку і грамадства. Актывізацыя інавацыйнай дзейнасці універсітэтаў непасрэдна звязана з перспектывай рэальнага забеспячэння гарантый на інтэлектуальную ўласнасць па выніках даследаванняў, стварэнне эфектыўных спосабаў кіравання правам інтэлектуальнай уласнасці. Інавацыйная дзейнасць вну паступова становіцца абавязковым кірункам дзейнасці поруч з навучаннем і навуковымі даследаваннямі.

Асаблівасць пераходу да новага этапу адукацыйнай рэформы ў тым, што рашэнне названых задач плануецца ажыццяўляць праз удасканаленне адладжаных і ўкараненне інавацыйных падыходаў і тэхналогій. Большасць сучасных даследчыкаў схіляецца да таго, што «інавацыі» ў адукацыйным працэсе павінны ўжывацца з «традыцыямі» – ажыццяўляцца на базе традыцый. У сучасных умовах інавацыі разглядаюцца як складаны шматузроўневы працэс. У шырокім разуменні *інавацыя* – гэта тып дзейнасці, які выходзіць за межы выпра-

цаваных нормаў (з'яўляецца нерэгламентаваным) і тым самым выводзіць прафесійную дзейнасць на прынцыпова новы якасны ўзровень. У педагагічнай галіне інавацыя – гэта актыўнае назапашванне педагагічных навацый, іх асваенне педагагічнай супольнасцю і як вынік – эфектыўнае выкарыстанне ў практыцы выключна на навуковай аснове.

Слоўная парадыгма *навацыя, інавацыя, інавацыйная дзейнасць* у навуцы ўсё яшчэ знаходзіцца на стадыі тэрміналагізацыі. Але ўжо дастаткова выразна акрэслілася прынцыповая розніца паміж паняццямі «навацыя» і «інавацыя». «Основанием такого различения должны служить конкретные формы, содержание и масштаб преобразовательной деятельности. Так, если деятельность кратковременна, не носит целостного и системного характера, ставит своей задачей обновление (изменение) лишь отдельных элементов некой системы, то мы имеем дело с новацией. Если деятельность осуществляется на основе некоторого концептуального подхода, и ее следствием становятся развитие данной системы или ее принципиальное преобразование – мы имеем дело с инновацией» [3, с. 26].

Паколькі педагагічныя інавацыі праяўляюцца непасрэдна ў самой адукацыйнай практыцы, то інавацыйная дзейнасць у адукацыі выступае пераважна ў якасці прыкладнога выніку, які мае характар практычнай распрацоўкі. Інавацыйная адукацыйная практыка павінна быць звязана з наданнем адукацыйнаму працэсу стану аптымальнай адпаведнасці паміж закладзеным у ім культурным зместам, які якасна змяняецца як паводле аб'ёму, так і паводле складу, і індывідуальнымі магчымасцямі навучэнцаў. Само слова «інавацыя» з'явілася ў лацінскай мове яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. і абазначала «ўвядзенне новага ў пэўную сферу, спараджэнне шэрагу змен у гэтай сферы». Значыць, інавацыя – гэта двуадзіны працэс абнаўлення, рэалізацыі, укаранення і адпаведна гэта дзейнасць па ўвядзенні навацый у пэўную сацыяльную практыку. За час ад увядзення ў навуковы ўжытак тэрміна *«інавацыя»* ў 30-я гг. XX ст. у якасці сацыялагічнага (інавацыі паўсталі як супрацьпастаўленне традыцыйным формам культуры, мыслення і паводзінаў) ён прайшоў стадыю *палітычнага тэрміна* для абазначэння постіндустрыйнай фармацыі (пераход ад вытворчасці тавараў і паслуг да вытворчасці наваўвядзенняў у любой сферы чалавечага грамадства). Беларусь набыла магчымасць уключыцца ў гэтыя працэсы толькі ў якасці самастойнай дзяржавы ад пачатку 90-х гг. XX ст. Сёння аб'ектыўна паўсталі праблемы выпрацоўкі прыярытэтаў навукова-тэхнічнага развіцця, якія б забяспечылі павышэнне якасці жыцця, развіццё інфармацыйных тэхналогій, вырашэнне праблем экалогіі і медыцыны. Гэта значыць, што ў краіне павінен адбыцца паслядоўны пераход на шлях інавацыйнага развіцця, які ўключае ў сябе **назапашванне інавацый** (канчатковы вынік творчай працы), **інавацыйную дзейнасць** (стварэнне новага ці ўдасканаленага прадукту), **стварэнне інфраструктуры інавацыйнай дзейнасці** (усталяванне арганізацыі, якая забяспечвае суб'ектаў інавацыйнай дзейнасці паслугамі, неабходнымі для ажыццяўлення інавацыйнай дзейнасці). Крыніцаю інавацый можа выступаць навука, вытворчасць, эканоміка, палітыка, дзе выспяваюць інавацыйныя прапановы – навацыі, вынаходніцтвы, адкрыцці, рацыяналізатарскія прапановы; на аснове прапаноў ажыццяўляецца інавацыйная дзейнасць – рэалізацыя навацый паводле тэхналогіі навучання, укаранення, трансляцыі; тым самым забяспечваецца інавацыйны працэс, які прадугледжвае разнастайныя формы і спосабы ўкаранення навацый у практыцы; на завяршальным этапе выпрацоўваецца новы тып ці новая форма грамадскай практыкі.

Універсальным крытэрыем якасці адукацыйных інавацый павінен лічыцца ўзровень раскрыцця патэнцыяльных магчымасцяў іх суб'ектаў [4]. Вырашацца такія задачы могуць праз асэнсаванне і ўдасканаленне методык, арыентаваных на інфармацыйнае насычэнне студэнтаў, і праз увядзенне інавацыйных падыходаў і тэхналогій для фарміравання творчай асобы. Адукацыйны працэс на сучасным этапе скіраваны найперш на чалавека ініцыятара і стваральніка, а навучанне павінна фарміраваць у кожнага асабістае веданне (вопыт) пра тое, што і як яны павінны рабіць у сваёй прафесійнай сферы. Інавацыі ў адукацыйнай практыцы павінны ўлічваць прагматычны аспект: фарміраваць у студэнтаў здольнасць самастойна шукаць і знаходзіць веды, умець актуалізаваць іх не толькі ў адпаведнай галіне, але і праектаваць на рэальнае быццё. Суб'ект адукацыі – навучэнец – павінен быць арыентаваны на самастойны пошук і рэалізацыю атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці. Адсюль вынікаюць і новыя патрабаванні да арганізацыі працэсу навучання і ацэнкі яго якасці. У сістэме адукацыі неабходна пераадольваць інерцыю, якая прадугледжвае перадачу ведаў ад педагога, замест таго, каб авалодваць ведамі пад кіраўніцтвам педагога. Распрацоўваюцца інавацыйныя псіхатэхналогіі, скіраваныя на павышэнне крэатыўнасці асобы, яе эмацыйнай, інфармацыйнай і кагнітыўнай устойлівасці. Пашыраюцца такія новыя педагагічныя тэхналогіі, як нейралінгвістычнае праграмаванне, дзе працэс навучання паўстае ў выглядзе руху інфармацыі праз розныя каналы

нервовай сістэмы чалавека [2]. Такім чынам, сучасная парадыгма адукацыйнай дзейнасці прадугледжвае прымяненне псіхапедагагічных тэхналогій для фарміравання індывідуальнасці з правам на інтэлектуальную і эканамічную свабоду, маральную аўтаномію, сацыяльную абароненасць.

Беларуская інавацыйная палітыка на сучасным этапе фарміруецца ў кантэксце глабальных працэсаў, што адбываюцца ў свеце. Паколькі на сусветным рынку галоўным прадуктам і таварам становяцца веды, то назіраецца паскарэнне інавацыйных працэсаў у эканоміцы развітых краінаў і стварэнне нацыянальных інавацыйных сістэм. Аналіз вопыту замежных краінаў паказвае, што ў інавацыйнай палітыцы прысутнічаюць тры асноўныя стадыі. Першая стадыя выступае ў якасці лінейнага працэсу развіцця інавацый (інавацыі праходзяць традыцыйны шлях камерцыяналізацыі навуковай дзейнасці – ад навуковай лабараторыі да навучальных устаноў). Другая стадыя прадугледжвае ўскладненую структуру інавацыйных сістэмаў, у якіх існуе зваротная сувязь паміж паслядоўнымі этапамі (лінейная мадэль), а таксама прысутнічае генерацыя і дыфузія інавацый унутры так званых інавацыйных сістэмаў (рэгіянальных, сектаральных і г. д.); гэта стадыя цэнтральнай ролі сістэмаў і інфраструктур, якія падтрымліваюць інавацыі. Трэцяя стадыя інавацыйнай палітыкі (стадыя будучыні) павінна забяспечваць цэнтралізацыю, надаваць прыярытэтную ролю інавацый у асобных сферах, найперш у навуковадаследчай дзейнасці. Забеспячэнне ўсіх стадый інавацыйнай палітыкі прадугледжвае кваліфікаваную інавацыйную дзейнасць з дакладным вызначэннем формаў, суб'ектаў, мэтаў, сродкаў і ўмоваў ажыццяўлення.

Забяспечыць гэта магчыма толькі праз навуковае даследаванне і навуковую ацэнку ўсяго комплексу інавацый, спарадкавання іх у межах інавацыйных праектаў, праграмаў і рэформаў, якія б забяспечылі кампетэнтнае кіраванне інавацыйнымі працэсамі і спрыялі б мадэрнізацыі адукацыі ў цэлым. У перспектыве павінна адбывацца дыстантаванне ад класічнай тэорыі сістэмаў у арыентацыі на сучасную тэорыю складаных сістэмаў, здольных да самаарганізацыі на аснове ўзмацнення ролі асобнай даследчай сферы адукацыйных ведаў – філасофіі адукацыі, што дасць магчымасць спрагназаваць дастаткова канкрэтную мадэль будучыні праз адпаведную мадэль сучаснай (мадэрнізаванай) адукацыі і пазбавіцца ад «кустарна-інтуітыўных парываў» педагогаў ад практыкі. Але разам з тым інавацыйная дзейнасць не павінна атаясамлівацца з навуковай дзейнасцю. У якасці размежавальных фактараў У. І. Слабодчыкаў прапанаваў шэраг так званых «абмежаванняў»:

1) інавацыйная дзейнасць павінна прыводзіць да істотных зменаў у параўнанні з усталяванай традыцыяй;

2) інавацыйная дзейнасць скіравана на рашэнне комплекснай праблемы, якая ўзнікае ў выніку сутыкнення традыцыйнага і новага;

3) інавацыйная дзейнасць прадугледжвае назапашванне інавацыйнага вопыту, яго спарадкаванне і выпрацоўку механізма перадачы;

4) сэнс інавацыйнай дзейнасці заключаецца ў абнаўленні традыцыйнай практыкі і ў стварэнні прынцыпова новай практыкі [3, с. 24–25].

Такім чынам, інавацыйная дзейнасць на сучасным этапе паўстае як цэласная тэарэтычная, метадычная і тэхналагічная канцэпцыя абнаўлення педагагічнай дзейнасці, якая забяспечвае выхад *на прагназаваны ўзровень*.

## Літаратура


1. Гончаренок И. И. Инновационная деятельность как новая миссия университетов // Кіраванне ў адукацыі. – 2005. – № 3. – С. 4–7.
2. Кириченко А. В. Современные психологические технологии влияния на личность в профессиональных целях / Науч. ред. А. А. Деркач. – М.: Тесей, 2003.
3. Слободчиков В. С. Инновации в образовании // Педагогические инновации. – 2004. – № 1. – С. 17–36.
4. Янчук В. А. Перспективы и оценка образовательных инноваций // Кіраванне ў адукацыі. – 2005. – № 4. – С. 11–20.